# Секция 8

# ПЕДАГОГИКА СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ: СОВРЕМЕННЫЕ ФОРМЫ И ПУТИ РАЗВИТИЯ

## *Подсекция 1*

УДК 379.81(476)

***Н. І. Гуд,***
*старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*

## ПРАБЛЕМНЫЯ АСПЕКТЫ АРГАНІЗАЦЫІ СУЧАСНЫХ СВЯТ БЕЛАРУСІ

**Анатацыя.** Разглядаюцца праблемы і шляхі рашэння пры арганізацыі сучасных свят Беларусі, пытанні падтрымкі творчай дзейнасці з боку дзяржавы. Акрэслены пытанні забеспячэння рэжысёрска-пастановачнай групы, роля рэжысёра ў стварэнні сучаснага масавага свята. Аналізуюцца тэндэнцыі далейшага развіцця жанру масавых мастацкіх прадстаўленняў.

**Ключавыя словы:** свята, праблема.

***N. Gud,***
*Senior Lecturer of the Department of Pedagogy of Socio-Cultural Activities of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Republic of Belarus*

## PROBLEMATIC ASPECTS OF THE ORGANIZATION OF MODERN HOLIDAYS IN BELARUS

**Abstract.** The article examines the problems and ways of solving them in the organization of modern celebrations of Belarus, the issues of support of

creative activity by the state, outlines the issues of providing a directing and production group, the role of the director in creating a modern mass celebration, analyzes the trends of further development of the genre of mass artistic performances.
**Keywords:** holiday, problem.

Арганізацыя масавых свят у Беларусі сёння перажывае пэўны крызіс: яны не прыносяць прыбытку, а наадварот, патрабуюць вельмі істотных затрат, і таму правядзенне дадзеных мерапрыемстваў немагчыма без дапамогі ўрада краіны.

Поўнамаштабнае дзяржаўнае фінансаванне творчай дзейнасці на былым узроўні аказалася для сучаснай беларускай эканомікі складанай задачай. Як сведчыць практыка, дастатковае фінансаванне ў наш час атрымліваюць толькі некаторыя мерапрыемствы, такія як Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і Рэспубліканскае свята працаўнікоў сяла «Дажынкі». У іншых выпадках фінансавае забеспячэнне яўна недастатковае, што ў выніку вельмі абмяжоўвае фантазію рэжысёра, перашкаджае з’яўленню новых ідэй, якія не маюць падтрымкі ў творчым, матэрыяльна-тэхнічным, арганізацыйным і фінансавым вырашэнні і таму застаюцца нерэалізаванымі.

Нізкія па сусветных мерках зарплаты членаў рэжысёрска-пастановачных груп правакуюць адток творчых кадраў за мяжу або прымушаюць шукаць іншую работу. Гэта ў значнай ступені спараджае нізкі ўзровень творчай ініцыятывы. Аднастайнасць і трафарэтнасць у творчасці і арганізацыі мерапрыемстваў прыносяць шкоду далейшаму развіццю і ўдасканальванню правядзення свят у краіне.

Практыка сусветнай рэжысуры паказвае, што сучасныя святы здзяйсняюцца пры дапамозе такіх рэжысёрскіх выразных сродкаў, як узбуйненая масавая сцэна, дзе занята вельмі многа ўдзельнікаў; пастановачная тэхніка, піратэхніка, камп’ютарная графіка, светлавыя і гукавыя спецэфекты, сучасныя тэхнічныя супертэхналогіі і інш., што патрабуе значных фінансавых укладанняў. У той жа час сучасная святочная рэчаіснасць Беларусі даказвае наступнае: у адрозненне ад практыкі мінулых гадоў, зараз любая творчая задума можа быць рэалізавана толькі тады, калі мае добрую эканамічную базу.

Рэжысёр сёння выступае не толькі ў якасці творцы, але і ў значнай ступені ў ролі арганізатара, эканаміста, адміністратара, які павінен суадносіць маштаб сваіх планаў з рэаліямі матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых сродкаў, выдзеленых на пастаноўку. Таму вывучэнне, асэнсаванне і ўкараненне ў сучасную пастановачную практыку назапашанага вопыту замежных рэжысёраў для вырашэння пытанняў тэхналогіі арганізацыі святочных дзей у адзінстве з творчымі праблемамі з'яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

На сучасным этапе можна выдзяліць некалькі тэндэнцый далейшага развіцця жанру масавых мастацкіх прадстаўленняў:

1. Больш глыбокае ўзаемапранікненне, сінтэз спорту і розных жанраў мастацтва ў сінтэтычных нумарах з сольнымі блокамі і масавым фонам.

2. Аб'яднанне нумароў з цыркавымі і масавай харэаграфіяй.

3. Актыўнае ўкараненне тэхналогій пры падрыхтоўцы ўсіх цыклаў мерапрыемства, ад тэатралізаванага да цырыманіяльнага.

4. Узмацненне ролі тэлебачання і далейшы пераход у сувязі з гэтым на глабальны і наднацыянальны характар зместу саміх прадстаўленняў; з'яўленне галоўных адзінкавых персанажаў з дакладнай іх індывідуалізацыяй для глядача пры дапамозе новых тэхналогій.

5. Праца каманды пастаноўшчыкаў, якая, у сваю чаргу, складаецца з міжнародных спецыялістаў. Трэба ўлічваць іх асабісты вопыт, а не толькі геаграфічныя, гістарычныя і сацыяльныя асаблівасці таго ці іншага прадстаўлення, г. зн. агульны эфект сінэргіі.

Такім чынам, улік выказаных прапаноў дапаможа падняць святочную культуру Беларусі на якасна новы ўзровень.


1. *Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. А. Гуд. – Мінск : БДУК, 2004. – 223 с.

2. *Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студудентв вузов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТеатраСистемс, 2004. – 222 с.

УДК 379.81

***О. В. Рогачёва,***
*кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Республика Беларусь*

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ МЕТОДА ГЛУБИННОГО ИНТЕРВЬЮ В ДОСУГОВОМ КОНСУЛЬТИРОВАНИИ

**Аннотация**. В статье раскрывается потенциал использования метода глубинного интервью в досуговом консультировании. В связи с серьезными социально-культурными и экономическими изменениями последних десятилетий происходит трансформация не только понятия сущности досуга, свободного времени, но и его бюджета. Это приводит к обновлению и расширению компетенций организаторов досуга: важными становятся навыки проведения исследований в данной области. Анализируются сущность метода глубинного интервью, его преимущества и возможности использования фокусированного и нефокусированного глубинного интервью в работе досугового консультанта. Описывается методика проведения глубинного интервью.

**Ключевые слова:** глубинное интервью, фокусированное и нефокусированное глубинное интервью, досуг, досуговая деятельность, досуговое консультирование.

***O. Rogachova,***
*Candidate of Pedagogy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Pedagogy of Social and Cultural Activities of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Republic of Belarus*

# USING THE DEPTH INTERVIEW METHOD IN LEISURE COUNSELING

**Abstract**. The article reveals the potential of using the in-depth interview method in leisure counseling. In connection with the serious socio-cultural and economic changes of recent decades, there is a transformation not only of the essence of leisure and free time, but of its budget. This leads to the renewal and expansion of the competences of leisure organizers; research skills become important. The author analyzes the essence of the in-depth interview method, its advantages and the possibility of using focused and